Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне № 691 ад 25.09.2009 г.
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

**№ 3 (105)' 2011**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**Мікалай Іосіфавіч МІНІЦКІ — галоўны рэдактар,** *доктар гістарычных навук, прафесар*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ВАРАНОВІЧ**
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ — старшыня рэдакцыйнай рады**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук, прафесар*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

# НА ШЛЯХУ ДА НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАГА СУПРАВАДЖЭННЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*Аляксандр Корзюк, кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка*

У верасні 2010 г. у выдавецтве БДПУ імя Максіма Танка выйшаў вучэбна-метадычны дапаможнік «Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе». Ён распрацаваны ў адпаведнасці з Дзяржаўным стандартам па спецыяльнасці «Гісторыя», зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, і тыпавой вучэбнай праграмай па методыцы выкладання гісторыі для вышэйшых навучальных устаноў. Выданне мае грыф Вучэбна-метадычнага аб'яднання па педагагічных навуках Рэспублікі Беларусь і рэкамендавана ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў па спецыяльнасцях 1-02 01 01 Гісторыя; 1-02 01 02 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць*.

Гісторыя Беларусі як вучэбны прадмет з'яўляецца арганічнай часткай сучаснай адукацыйнай прасторы, спрыяе фарміраванню гістарычнай памяці і гістарычнай свядомасці школьнікаў. У адпаведнасці з асобасна арыентаванай парадыгмай сучаснай адукацыі вывучэнне гісторыі накіравана на фарміраванне ў школьнікаў якасцей асобы, неабходных для выканання агульных для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь сацыяльных функцый, абумоўленых сістэмай каштоўнасцей, агульнапрынятых у беларускім грамадстве. Сярод іх вылучаюцца ўсведамленне школьнікамі своеасаблівага шляху беларускага народа, асэнсаванне самабытнасці яго культуры, выхаванне пачуцця адказнасці за яго далейшы гістарычны лёс, фарміраванне ўмення шанаваць культурную разнастайнасць.

Дапаможнік складаецца з чатырох частак. У *першай частцы* на падставе аналізу Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі», Адукацыйнага стандарту і вучэбнай праграмы па прадмеце разглядаюцца асаблівасці зместу гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. і вылучаюцца асноўныя элементы структуры гістарычных ведаў школьнікаў. Вялікая ўвага надаецца вызначэнню тых элементаў зместу вучэбнага матэрыялу, якія могуць спрыяць фарміраванню ў іх устойлівага пазнавальнага інтарэса да вывучэння гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. Прадстаўлены магчымыя шляхі фарміравання гістарычнай эмпатыі і індывідуальнага асэнсавання школьнікамі зместу гістарычнага матэрыялу.

*Другая частка* дапаможніка прысвечана арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці дзесяцікласнікаў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі. Паслядоўна разглядаюц-

* *Корзюк, А. А.* Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе : вучэб.-метад. дапаможнік / А. А. Корзюк; пад рэд. докт. гіст. навук, праф. М. М. Забаўскага. — Мінск : БДПУ, 2010. — 152 с.

ца арганізацыйныя формы, актыўныя метады і прыёмы навучання, якія характарызуюцца актывізацыяй мыслення, павышанай ступенню матывацыі і эмацыянальнасці, забеспячэннем непасрэднага ўдзелу вучняў у адукацыйным працэсе, пастаянным узаемадзеяннем і арганізацыяй сумеснай рэфлексіўнай дзейнасці настаўніка і вучняў і спрыяюць эфектыўнаму засваенню зместу гістарычнай адукацыі. Даецца падрабязная характарыстыка форм правядзення ўрока, якія ў найбольшай ступені спрыяюць рэалізацыі адукацыйнага патэнцыялу зместу вучэбнага матэрыялу па гісторыі Беларусі ў IX класе (практыкумы, экскурсіі, дыспуты, лабараторныя заняткі, канферэнцыі і інш.). Паказаны магчымыя шляхі рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу ў навучанні на ўроках гісторыі Беларусі.

У *трэцяй частцы* коратка аналізуюцца магчымыя сродкі навучання (у тым ліку і электронныя), якія настаўніку мэтазгодна выкарыстоўваць пры правядзенні ўрокаў па прадмеце, а таксама прадстаўлены магчымыя арганізацыйныя шляхі, метадычныя прыёмы, сродкі і формы навучання да кожнага ўрока па гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.

У *чацвёртай частцы* разглядаецца методыка вывучэння 12 асобных тэм па гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. Яны пераважна звязаны з ваеннапалітычнымі падзеямі і гісторыяй нацыянальнай культуры. На наш погляд, менавіта гэтыя кампаненты зместу гістарычнай адукацыі ў значнай ступені спрыяюць рэалізацыі навучальных і выхаваўчых магчымасцей прадмета і маюць асаблівую важнасць для фарміравання каштоўнасна-светапоглядных арыентацый вучняў. Прыводзяцца прыкладныя тэксты работ для пісьмовага тэматычнага кантролю ведаў. Прапанаваныя ў дапаможніку метадычныя распрацоўкі ўрокаў, падборкі пазнавальных заданняў, дыдактычных матэрыялаў і г. д. былі апрабіраваны аўтарам на працягу 15-гадовай практыкі выкладання ў агульнаадукацыйнай школе, многія з іх былі надрукаваны на старонках часопіса «Гісторыя: праблемы выкладання».

Пасля кожнай часткі прапануюцца кантрольныя пытанні і заданні, якія маюць выразную практыка-арыентаваную скіраванасць, а таксама ёсць спіс цытуемай літаратуры. Акрамя таго, у канцы дапаможніка змешчаны структураваны спіс літаратуры, якая можа быць карыснай настаўніку пры падрыхтоўцы і правядзенні ўрокаў па гісторыі Беларусі ў IX класе ў дапаўненне да тых выданняў, на якія зроблены спасылкі ў кнізе. Спадзяёмся, што ён можа стаць арыенцірам для больш грунтоўнага самастойнага вывучэння праблем методыкі выкладання гісторыі, а таксама для падрыхтоўкі да практычных заняткаў. Думаецца, што гэта выданне паспрыяе паляпшэнню якасці падрыхтоўкі будучых настаўнікаў гісторыі і забеспячэнню навукова-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу па гісторыі Беларусі ў школе.